

Download

Вясна / Правы чалавека ў Беларусі

👩‍⚖️Жыхара Баранавічаў асудзілі за каментар «ч*рка гребаный» пад відэа з Караевым

18 жніўня адбыўся разгляд крымінальнай справы ў дачыненні да **Дзяніса Дзянісава**, якога вінавацілі ў абразе прадстаўніка ўлады паводле арт. 369 Крымінальнага кодэкса.

👩Мужчыну вінавацілі ў тым, што ён у тэлеграм-чаце “Барановичи свободные” пад відэа з выявай былога міністра ўнутранных спраў Юрыя Караева напісаў каментар - “ч*рка гребаный”, чым публічна абразіў прадстаўніка ўлады у сувязі з выкананнем ім сваім службовых абавязкаў.

Сваю віну Дзяніс прызнаў, не адмаўляў, што пакінуў каментар, але патлумачыў, што не меў намеру абразіць канкрэтна Караева. Падчас следства ён казаў, што пра наступствы ад каментара не думаў, сваімі дзеяннямі - выказваў сваё стаўленне да падзеяў у краіне і той жорсткасці з боку сілавікоў, што бачыў у сацсетках.

🙆Суддзя **Мікалай Кміта** даводзіў абвінавачанаму, што ён не толькі абразіў Караева як прадстаўніка ўлады, але і па нацыянальнаму прызнаку, бо “ч*рка” ўжываецца да людзей іншай нацыянальнасці.

“Гэта абраза нацыяльнасці, пасады і чалавека. Тры аксіёмы”, — сказаў суддзя.

Дзянісаў казаў, што гэтае слова выкарыстоўваецца і ў тэхнічнай мове ў дачыненні да неапрацаванага абрубка дрэба ці метала, але лінгвістычная экспертыза ніколі не будзе на яго баку. Указваў, што не хацеў абразіць Караева па нацыянальнасці, бо нават не ведае яе.

📌Падчас спрэчак бакоў пракурорка **Наталля Кардаш** прасіла суд прызнаць Дзяніса Дзянісава вінаватым і пакараць яго **двума гадамі абмежавання волі з накіраваннем** ва ўстанову адкрытага тыпу. Менавіта такі прысуд і вынес суддзя.

t.me/viasna96/6750

4.5K viewsedited Aug 19, 2021 at 17:30

Context

Embed

View In Channel

```
<script async
src="https://telegram.or
g/js/telegram-widget.js?
```

Copy